**І.Д. Воюш**

## Жанчына ў літаратуры: ад архетыпа да мастацкага вобраза

Род людскі спрадвеку падзелены на дзве палавіны – мужчынскую і жаночую. Бясспрэчна, што яны павінны ўтвараць адно непадзельнае гарманічнае цэлае. Да бронзавага веку роўнасць паміж людзьмі, мужчынамі і жанчынамі, была асновай грамадскага ладу. Пра гэта сведчаць творы старажытнагрэчаскага паэта Гесіода (“аб залатым родзе чалавечым”), біблейскія міфы аб Ліліт і Эдэме, што з’яўляюцца адгалоскамі старамесапатамскіх легенд, даследаванні Генрыха і Марыі Шліман аб гамераўскай Троі, старажытнакітайскі трактат “Дао дэ цзін” і апошнія археалагічныя доследы мінойскай культуры Крыта (паводле Рыаны Айслер і інш.). Раннія цывілізацыі войнаў не вялі: у старажытных паселішчах адсутнічаюць абарончыя збудаванні, разбурэнні, якія маглі быць прычынены вайной, не знойдзена таксама помнікаў мастацтва з выявамі ваенных сцэн. Гэта значыць, там існавала т. зв. “біярхатнае” грамадства, асновай якога з’яўляліся партнёрскія адносіны.

Услед за агульнавядомымі дагістарычнымі багінямі-ідаламі плоднасці і дабрабыту чалавечая вера ў высокае стварыла больш складаную міфалагічную сістэму. Гэта найперш старажытнакітайскі міф аб Маці Паднябеснай, якая нарадзіла свет, дзе ў гарманічнай еднасці суіснавалі мужчынскі (*ян*) і жаночы (*інь*) пачаткі. У Японіі ўзнікае сінтаісцкая версія міфа аб стварэнні свету багіняй Аматэрасу – “тою, што ззяе на небасхіле”, якая блаславіла Краіну Узыходзячага Сонца і паслала на зямлю свайго ўнука /6, с. 130/. У славянскім язычніцкім пантэоне праслаўлялася жаночае боства Мокаш, жонка Перуна, якая, падобна старажытнагрэчаскім мойрам, прала нітку жыцця /4, с.169/. Па-за пантэонам знаходзілася боства ніжэйшага ўзроўню – Жыва, якая быццам бы дарыла жыццё. Выява Сусветнага дрэва ў паўночнаславянскіх вышыўках таксама часта афармлялася ў вобразе жанчыны з узнятымі рукамі. На пачатку ХХ ст. рускія філосафы Салаўёў у працы “Чытанні аб богачалавецтве”, Фларэнскі ў трактаце “Столп і сцвярджэнне ісціны”, Бярдзяеў у “Філасофіі свабоды” звярнуліся да вобраза Прамаці Свету, Мудрасці Свету – Сафіі.

Як бачым, з Усходу на працягу вякоў ішла ўстойлівая тэндэнцыя да стварэння жыццесцвярджальнага і жыцценараджальнага жаночага боства.

Аднак індаеўрапейская міфалогія прынесла ў Еўропу іншы прадмет пакланення – Бога-грамабоя, Бога-лучніка, Бога-воіна. (Што істотна -- гэтае боства было з самага пачатку мужчынскага роду). З заваёўнікамі прыйшлі паняцці сілы, улады і няроўнасці. Такім чынам “мужчынскі воблік Бога трапіў і ў хрысціянскую традыцыю” /6, с. 70/. Як жа патрыярхальны лад адбіўся ў масавай свядомасці народаў? Ужо старажытныя грэкі адмаўлялі жанчыне ў праве голасу ў сям’і і грамадстве. Індыйскія “Законы Ману” сцвярджаюць, што “ў дзяцінстве жанчына павінна падпарадкоўвацца бацьку, у юнацтве – мужу,

пасля смерці мужа – сынам...”. Артадаксальны іудзей пачынаў сваю малітву словамі: “Дзякую табе, Божа, што не стварыў мяне жанчынай!” Біблія кажа: “Жонкі, павінуйцеся сваім мужам, як Госпаду, бо муж ёсць галава жонкі, як і Хрыстос галава царквы”. У Каране аналагічна чытаем: “Мужы стаяць над жонкамі за тое, што Алах даў адным перавагу перад другімі” /6, с. 66/.

Даследчык М.Хмялюк піша, што Маконскі (Vст. н.э.) і Стогаловы (XVIст.) царкоўныя саборы разглядалі ў свой час пытанне аб тым, ці называць увогуле жанчыну чалавекам і ці дазваляць пахаванне жанчын на адных могілках з людзьмі (г. зн. з мужчынамі) /7, с. 18/. А на Старажытным Усходзе жанчын патрабавалася хаваць на чвэрць глыбей, чым мужчын, каб і на тым свеце жаночая галава была ніжэй. У Індыі ж да 1839 г. існавала традыцыя *сації* (самаспалення ўдоў пасля смерці мужа).

Рэлігія, якая доўгі час панавала ў якасці афіцыйнай ідэалогіі, стала выразна мужчынскага роду, як, бадай, і філасофія, якая не прызнавала за жанчынамі права роўнасці (Бэкан “Новы арганон”, Ніцшэ “Так гаварыў Заратустра”, Кант “Метафізіка нораваў”, Сатр “Быццё і нішто”, Вейнінгер “Пол і характар”).

Такім чынам, гаворачы словамі “Дао дэ цзынь”: “*...калі парушаецца Дао – перарываецца сувязь інь і ян, -- то ўсё разладжваецца. Калі прыціскаецца адна палавіна, непазбежна церпіць другая. Прыніжэнне адной палавіны... не можа не прывесці да выраджэння другой палавіны. А ў канчатковым выніку – да разбурэння цэлага, хай тое будзе народ, сям’я, космас...*” /6, с. 115/. Перадумовы для гэтага рзбурэння парытэту, як бачым, былі. Выхадам з такога становішча стала разняволенне (эмансіпацыя) падпарадкаванай “палавіны”, перыяды ўздыму якога былі звязаны: 1) з распаўсюджваннем хрысціянства (V-VIст.), калі ўвасобленым жаночым пачаткам стала Дзева Марыя; 2) з пачаткам крыжовых паходаў (XI-XIIIст.), з’яўленнем рыцарства і культу Прыгожай дамы ў Заходняй Еўропе; 3) з рухам суфражызму (XIXст.) у ЗША і Заходняй Еўропе; 4) з нараджэннем фемінісцкага руху (XXст.) /6, с.4/.

Менавіта ў сярэдзіне XXст. аднавілася ідэя гарманічнага біярхатнага грамадства, дзе нормай адносін сталі б не “*стандартызацыя*” паводзін і дзейнасці “*па полавай прыкмеце*”, а “*аўтаномная самакіруемая і самавызначальная асоба*” (Элен Эсістэр) /6, с.33/. З гэтай прычыны актуальным становіцца вывучэнне маладаследаваных пытанняў у галіне гісторыі жанчын, іх культуры і псіхалогіі, творчасці і, натуральна, іх ролі ў мастацтве (у нашым выпадку -- у літаратуры). Паколькі галоўным прызначэннем жанчыны заўсёды было мацярынства, то яму і будзе прысвечана спроба акрэсліць аспекты вывучэння вобраза маці ў беларускай літаратуры XXст..

Культуралагічнае і тэрытарыяльнае становішча Беларусі на мяжы традыцый заходняга, асновай якога з’яўляецца Бацька, і ўсходняга, асновай якога з’яўляецца Маці, светабачанняў абумовіла і ўзнікненне пэўнага рэгіянальнага славянскага (магчыма, і нацыянальнага) жаночага архетыпа,

адным са сродкаў выяўлення якога і з'яўляецца літаратура. Фактараў, якія сфарміравалі яго /архетып/, некалькі. Гэта элементы язычніцка-хрысціянскага (часткова ісламскага і іудаісцкага) светабачанняў і, як вынік, матывы уседаравання, непраціўлення злу насіллем, якія выражаюцца ў наданні архетыпу жанчыны-маці характарыстык высокай духоўнасці, вернасці блізкім і свайму роду (народу). У літаратуры гэта звязана з сюжэтамі выратавання свету і чалавечага лёсу сілаю мацярынскай любові, гарманізацыі супярэчлівага свету, адмаўлення ўсіх праяў прыгнёту або гвалтоўнага спосабу вырашэння праблем. Істотную ролю адыгрывае біялагічная, полавая прыналежнасць жанчыны – дзяўчыны, нявесты, жанчыны-маці, якая нараджае і выхоўвае дзіця, -- у якасці перадумовы "мацярынскага мыслення", "жаночай этыкі", а таксама такіх праяўленняў жаночага пачатку як пачуццё адказнасці за сваю сям'ю і род, мудрасць, ахвярнасць, самаадданасць да самазабыцця і самаадмаўлення, стойкасць у перажыванні нядолі і разлукі, прыхільнасць да канструктыўнага пачатку ў зносінах, эмацыянальна-інтуітыўнае рэагаванне на змены ў навакольнай рэчаіснасці. У гендэрным аспекце найбольш важным фактарам уяўляецца сацыяльна-культурная функцыя жанчыны-маці як ахоўніцы і ўпрыгожвальніцы хатняга ачага, як прадстаўніцы бытавой, прыватнай «жаночай» сферы, стваральніцы сітуатыўнай, пазітыўна афарбаванай камунікацыі, носьбіткі імкнення і ўмення суперажываць, разумець, эстэтычна перажываць і адлюстроўваць свет. Бясспрэчны і ўплыў на масавую свядомасць дзейнасці канкрэтных асоб: Ефрасінні Полацкай, Рагнеды, Саламеі Пільштыновай-Русецкай, Элізы Ажэшкі, Цёткі, Ларысы Геніюш, Святланы Алексіевіч і інш.

Шматгранныя праявы архетыпу жанчыны-маці знайшлі сваё адлюстраванне не толькі ў масавай свядомасці, але і ў мастацкай літаратуры. Вобраз жанчыны ўвабраў у сябе і рысы самога архетыпу як абагульненага аб'екта мастацкага пазнання свету, і суб'ектыўныя, адметныя характарыстыкі, нададзеныя яму як аўтарам так і рэцыпіентам – носьбітам сваёй уласнай індывідуальнасці. Жанчына-маці ўспрымаецца як выразніца нацыянальнай адметнасці (бо, паводле сведчання этнографаў, нацыянальнае выяўляецца менавіта ў «жаночай справе» -- прыгатаванні страў і выхаванні дзяцей), як увасабленне паняцця роднага кута, як вобраз, што асацыіруецца з роднай мовай, «матчынай мовай» (*...ты струменьчык матчынай мовы, / Быццам маці, не забывай ...* У.Караткевіч) /2, с.249/, як Прырода-матухна, якая дала жыццё зямлі і чалавеку на ёй.

Матыў светлага матчынага вобраза, які праменіць з успамінаў маленства, прысутнічае ў многіх карцінах эпасу і лірыкі: у паэме Я.Коласа "Новая зямля", аповесці Я.Брыля "Ніжнія Байдуны", паэме А.Куляшова "Далёка да акіяна", аповесці А.Кудраўца "Раданіца", лірыцы Р.Барадуліна (зб. "Евангелле ад мамы"), аповесці А.Жука "Сны пра маму". У іх маці выступае як ахоўніца чыстага дзіцячага свету, разважлівая дарадчыца і клапатлівая гаспадыня, як

эпіцэнтр хатняга цяпла і ўтульнасці. Заўважым, што ў асацыятыўнай блізкасці да гэтага персанажа часта знаходзяцца іншыя глыбока напоўненыя вобразы, якія адцяняюць, высвечваюць высокі ўнутраны сэнс мацярынства. Гэта, напрыклад, вобраз *хлеба* як увасаблення дабрабыту ў вершы А.Вярцінскага “Маці пячэ хлеб”, *блінцоў* -- старажытнага сімвала сонца -- у раздзеле “Раніца ў нядзельку” з “Новай зямлі” Я.Коласа, *каравая* – сімвала пладнасці, *дзяжы* – месцішча хатняга духу, жніва і г. д. У творах, дзе галоўны герой страчвае маці, дзе ён сірата ці падчарка або няродны сын, адлюстроўваецца духоўная дысгармонія і глыбокі трагізм. Такім чынам, адбываецца ўскоснае сцвярджэнне агульнавядомай ісціны аб значнасці ролі маці ў росце і сталенні чалавека. Прыгадаем, напрыклад, шырокавядомыя творы: паэму Я.Коласа “Сымон-музыка”, апавяданне Цёткі “Міхаська”, апавяданне Я.Брыля ”Сірочы хлеб”, паэму А.Вярцінскага “Дажынкі”, раман В.Казько “Суд у Слабадзе”. Відавочна, што адна з перадумоў трагічнага гучання большасці з гэтых твораў -- адсутнасць або страта той неабходнай стрыжнявой апоры ў жыцці, якою з’яўляецца маці.

Глыбокім унутраным антаганізмам напоўнены творы аб вайне, дзе асабліва рэльефна выступае апазіцыя мацярынства як увасаблення той чалавечнай сілы, што здольна даць жыццё, і вайны як нялюдскай сілы, што знішчае, нявечыць яго. Так, сапраўдным трагічным пафасам напоўнены вобраз маці-паланянкі ў паэме-рэквіеме “Голас сэрца” П.Броўкі. Невырашальны ўнутраны канфлікт адбываецца ў душы галоўнай гераіні апавядання В.Быкава “Сваякі”, т. зв. “мацярынскае мысленне” якой не здольна прадбачыць і ўявіць магчымасці жорсткага і бессэнсоўнага забойства яе дзіцяці.

Самай высокай ступенню чалавечых пакут і самай страшнай караю, паводле нашай літаратуры, аказваецца асэнсаванае адмаўленне ад маці (апавяданне “На Каляды к сыну” З.Бядулі, верш “Зайграй, зайграй, хлопча малы...” П.Багрыма /”*...каб маці мяне не радзіла...*” / (8, с.36)), або ад свайго дзіцяці (раман “Чужая бацькаўшчына” В.Адамчыка), смерць ці падмена дзіцяці (раман “Подых навальніцы” І.Мележа, аповесць “Дзве душы” М.Гарэцкага). Такім чынам, з вышэй адзначанага бачым, што адной з іпастасяў жаночага вобраза з’яўляецца вобраз маці як роднага чалавека, як жыватворчай стрыжнявой духоўнай апоры і ў паўсядзённым жыцці, і ў жыцці літаратурнага персанажа.

Сіла творчага патэнцыялу мацярынскага пачатку часта свядома падкрэсліваецца пісьменнікамі. Напрыклад, у паэме “Варшаўскі шлях” А.Куляшоў пачаткі творчай здольнасці Твардоўскага бачыць у “*душы жнял*”, якою надзяліла яго маці-сялянка. Менавіта з вобразам маці звязваецца пазнанне асноў жыцця, унутранага ладу чалавечай душы, высокіх каштоўнасцей, адна з якіх бачыцца неад’емнай часткай мацярынскай існасці – гэта родная мова. Звернемся да аднаго з персанажаў п’есы Я.Купалы “Тутэйшыя” Мікіты Зносака. Яго здрада матчынай мове вядзе да здрады свайму народу і, у рэшце рэшт,

самому сабе. Менавіта Ганулю, маці Мікіты, з'яўляецца ў творы праваднікам ідэі "тутэйшасці", яна з апошніх сіл змагаецца за душу свайго сына, з яе вуснаў гучыць у творы беларускае слова. Верным сродкам, які здольны вярнуць чалавеку яго ўласнае "я" (і чалавечае, і нацыянальнае), бачыцца матчына слова і ў лірыцы. Мова маці, як і яна сама, увасабляе высокапаэтычную повязь з роднай зямлёй, гэта "*любай Маці-Радзімы вячыстае слова*" (Н.Гілевіч) /1, с.110/, невычэрпная крыніца любові і беларускасці, якая струменіць калыханкамі, жніўнымі песнямі, без якіх "*свет шырокі зрабіўся б цесен*" (М.Лужанін) /1, с.48/. Матчына слова – і першая школа жыцця, і "*народа душа і народа хвала*" (А.Бачыла) /1, с.89/. Яна ж звязвае ў адно вобразы маці і Беларусі ў А. Русецкага ("*...з ёю стаў бязмежна дарагім нам абшар бязмежнае Радзімы...*") /1, с.66/. Уяўленне аб нацыянальнай мове як калысцы жыцця ў С.Дзяргая і А.Вечара непасрэдна асацыіруецца з вобразам маці, чыя песня і мудрая казка ад дзіцячага веку былі побач з кожным. Ролі маці і мовы часта семантычна зблiжаны: і тая, і тая выхоўваюць новага чалавека, дапамагаюць усвядоміць сябе як асобу, з'яўляюцца школай пазнання свету, яны -- амаль раўназначныя імёны духоўнай еднасці людской долі і лёсу роднага краю.

І мама, і родная мова звязваюць чалавека з той зямлёй, якую ён называе Радзімай (*"...І тым заўсёды ганаруся, / што ў шчаслівейшую пару / я нарадзіўся ў Беларусі / і так, як маці, гавару..."* С. Грахоўскі) /1, с.75/. Нездарма параўнанне Радзімы і маці знайшло свой адбітак у многіх літаратурных творах. М. Багдановіч называе Беларусь Маці-краінай (верш "Пагоня"), адчувае сябе *сынам* роднай зямлі лірычны герой А. Гаруна (зб. "Матчын дар"), вобраз маці-сялянкі пашыраецца ў значэнні да вобраза ўсёй Радзімы ў апавяданні Я. Брыля "Маці". Сімвалічны купалаўскі вобраз забытай і сынам, і бацькам маці з драматычнай паэмы Я.Купалы "Сон на кургане", трагічны лёс якой асацыіруецца з цяжкімі выпрабаваннямі Беларусі. Гэтую парадыгму працягвае У. Караткевіч у рамане "Каласы пад сярпом тваім". Думаецца, у назве ўлоўлены сэнс мацярынскай ахвяры Беларусі ("зжатымі каласамі" – сваімі сынамі) у час паўстання 1863--1864г.г. дзеля новых, ненароджаных яшчэ пакаленняў ("новай руні", што вырасце з сабранага зерня), якія выяўлены ў кнізе.

Такім чынам, адзначым, што ў беларускай літаратурнай традыцыі назіраецца выразная тэндэнцыя да правядзення змястоўных паралеляў паміж вобразамі маці і Радзімы. Гэта праяўляецца ў праекцыі ўласнамацярынскіх якасцей, такіх як ахвярнасць, адданасць, занепакоенасць лёсамі сваіх дзяцей (як, напрыклад, у рамане Н. Гілевіча "Родныя дзеці"), уменне сілаю сваёй духоўнай творчасці знітаваць зямлю і тых, хто народжаны ёю, звонкімі струнамі роднай мовы, -- на больш шырокі вобраз Радзімы.

## Літаратура


1. Каласы роднай мовы / Укл. У. В. Анічэнка і інш. – Мн.,1990.
2. Караткевіч У. Збор твораў у 8 т. Т. 1. – Мн.,1987.

3. Манн Ю.В. Диалектика художественного образа. – М., 1987.
4. Мифы народов мира: Энц. В 2-х т. Т. 2. – М., 1992.
5. Рубашева З.В. Образ советской женщины в художественной литературе. – М., 1954.
6. Феминизм: Восток, Запад, Россия. – М., 1993.
7. Хмелюк Н. Д. Образ героини в советской литературе. – Киев, 1983.
8. Хрэстаматыя па беларускай дзіцячай літаратуры / Скл. М. Ф. Шаўлоўская. – Мн.,1989.